РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 чэрвеня 2025 г. СУБОТА № 119 (30507)

# «ВЕЛЬМІ ВАЖНА, КАБ ВЫ БЫЛІ НЕ ТОЛЬКІ ДОБРЫМІ СПЕЦЫЯЛІСТАМІ, АЛЕ І САПРАЎДНЫМІ ПАТРЫЁТАМІ»

## У дарослае жыццё — з каштоўнымі парадамі ад Прэзідэнта

Маладыя, прыгожыя, мэтанакіраваныя — учора ў Палацы незалежнасці былі менавіта яны. У Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі ёсць добрая традыцыя — напрыканцы навучальнага года сустракацца з найлепшымі выпускнікамі ВНУ і педагогамі. Чарговы раз урачыстыя цырымонія прайшла ў Палацы Незалежнасці. Сёлета маладых спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у краіне стала на 42 тысячы больш. Учора ўвечары ў сталіцы прайшоў Рэспубліканскі баль выпускнікоў ВНУ. А ўдзень найлепшыя з іх атрымалі ўзнагароды з рук Прэзідэнта. Не забыліся і аб тых, дзякуючы каму гэта стала магчымым, — педагогах. СТАР. 2–3



Фота БелТА.



АРЭНДНАЕ ЖЫЛЛЁ МОЖНА НАБЫЦЬ ВА ЎЛАСНАСЦЬ 4



ДЗЕНЬ, ЯКІ МЫ АБАВЯЗАНЫ ПОМНІЦЬ 8–9

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

# АБ САМЫХ СМАЧНЫХ ДРАНІКАХ І САМЫХ МОЦНЫХ СЕМ'ЯХ

## Як у Валожыне выбіралі «Уладара сяла — 2025»

Яркія эмоцыі, непаўторныя ўражанні, шмат песень, танцаў і пачастункаў — такая атмасфера панавала на Мінскім абласным этапе рэспубліканскага сямейнага сельскагаспадарчага праекта «Уладар сяла — 2025». Сам жа конкурс стаў сапраўдным святам сямейных традыцый, магчымасцю для маладых людзей гучна заявіць пра сябе. Карэспандэнты «Звязды» пазнаёміліся бліжэй з вясковымі сем'ямі — гарантамі харчовай бяспекі краіны — і высветлілі, хто прадставіць Міншчыну на рэспубліканскім этапе, які пройдзе на свяце ў Александрыі.




СТАР. 6–7




Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2025 года

Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

ISSN 1990 — 763X

25119

# «ВЕЛЬМІ ВАЖНА, КАБ ВЫ БЫЛІ СПЕЦЫЯЛІСТАМІ, АЛЕ І САПРАЎДНЫМІ



## «НЕ БОЙЦЕСЯ ЦЯЖКАСЦЯЎ І СКЛАДАНЫХ ЗАДАЧ»

«Сёння для вас асаблівы дзень. У ім лёгкі сум ад развітання з роднымі сценамі альма-матар і вельмі прыемнае прадчуванне будучых перамог, — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да герояў дня. — Ёсць такі афарызм: геній — гэта адзін працэнт натхнення і дзевяноста дзевяць працэнтаў цяжкай працы».

Кіраўнік дзяржавы пажадаў маладым людзям быць працавітымі. І падкрэсліў, што ў іх жыцці надыходзіць залаты час. «Не бойцеся цяжкасцяў і складаных задач. І, як я заўсёды кажу, рабіце ўсё своечасова, не адкладайце на потым. Таму што потым будуць іншыя праблемы і іншыя задачы, якія вам трэба будзе вырашаць. І самае галоўнае — не адступайце, калі памыліцеся. У жыцці бывае ўсякае: будуць і памылкі, будуць няўдачы. Але, як той казаў, не памыляецца толькі той, хто нічога не робіць. Той, хто шмат працуе і знаходзіцца ў пастаянным пошуку, несумненна, дамагаецца поспехаў, але і непазбежна здзяйсняе памылкі. Аднак гэтыя памылкі загартоўваюць і даюць сілы рухацца далей. Я жадаю, каб у вас было так», — сказаў маладым беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сучаснасць і будучыня Беларусі шмат у чым залежаць ад моладзі. «І вельмі важна, каб вы былі не толькі добрымі спецыялістамі, але і сапраўднымі патрыётамі, сацыяльна сталымі і духоўна багатымі людзьмі, якім можна даверыць лёс нашай Беларусі, — падкрэсліў ён.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**— Свет велізарны, а Беларусь — адна. У нас адна. Памятайце пра сваю Радзіму. Шануйце і беражыце мірнае неба над нашай краінай. Гэта самае дарагое, што мы — старэйшае пакаленне — змаглі захаваць для вас».**

Асобныя словы падзякі Прэзідэнт выказаў выкладчыкам за выхаванне моладзі, адданай роднай краіне, якая паважае традыцыі і захоўвае каштоўнасці беларускага народа. «Праца педагога важная і вельмі няпростая. Вы ўклалі педагагічны талент і велізарныя душэўныя сілы ў кожнага вучня. Дзякуй вам, паважаныя настаўнікі», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы павіншаваў усіх выпускнікоў ВНУ Беларусі з заканчэннем навучальнага года і пажадаў, каб абраная дарога вяла толькі да поспеху.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што калі б усе былі такімі, як прысутныя ў Зале дзяржаўных узнагарод маладыя людзі, то краіна была б вельмі багатая. Паколькі, па яго словах, багацце краіны не толькі ў тым, што ў зямлю Гасподзь паклаў, а ў таленавітых, мазгавітых людзях.

## «СІСТЭМА БУДЗЕ ДАНАСТРОЕНА»

Прэзідэнт расказаў, што ў найбліжэйшы час на яго ўзроўні яшчэ раз разгледзяць некаторыя праблемы адукацыі. «Сістэма будзе, прама скажу, сур'ёзна падрэгулявана і данастроена, — адзначыў ён. — Я абяцаў, што да адукацыі мы больш вяртацца не будзем, бо гэтыя рэформы ўжо людзям надакучылі.

**Мы больш не будзем закранаць чалавечыя аспекты, а зоймемся больш глыбіннымі пытаннямі. Для таго каб, калі цяперашняе пакаленне кіраўнікоў сыдзе са сцэны, вам, моладзі, было крыху лягчэй. Будзем гэтыя аўгіевы стайні расчышчаць. Мы не спыняемся на тым, што ў нас ёсць сёння ў сістэме адукацыі».**

У прыватнасці, Аляксандр Лукашэнка закрануў тэрміны на-

## Уражанні і планы



### «ПАДЗЯКА АД ПРЭЗІДЭНТА НАДАСЦЬ МНЕ МАТЫВАЦЫІ»

Маладыя людзі, якія атрымалі ўзнагароды, нягледзячы на ўзрост, ведаюць, што такое намаганні і цярністы шлях да мэты, інакш яны б не апынуліся ў Зале дзяржаўных узнагарод Палаца Незалежнасці. І яны дакладна ведаюць, як будаваць сваё жыццё далей.

**Дар'яна Вежнавец** скончыла Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Аркадзя Куляшова. Цяпер яна — логапед-дэфектолаг. Дар'яна застаецца ў родным Магілёве: размеркавалася ў адну са школ, але плануе паступаць у магістратуру. Падчас вучобы дзяўчына ўдзельнічала ў навуковай, грамадскай і валанцёрскай дзейнасці роднага ўніверсітэта. І ўсё гэта не перашкодзіла добрай вучобе. «Цудоўна, што ў нашай краіне дзеці з асаблівасцямі развіцця маюць доступ да адукацыі і ёсць спецыялісты, якія ім дапамагаюць атрымаць веды. Мая прафесія вельмі цікавая з пункту гледжання творчасці. У кожнага з дзяцей з парушэннямі маўлення свае асаб-

# НЕ ТОЛЬКІ ДОБРЫМІ ПАТРЫЁТАМІ»

вучання ў ВНУ і нагадаў, што ставіў задачу іх скараціць за кошт вывучэння ў меншым аб'ёме няпрофільных для тых ці іншых спецыяльнасцяў дысцыплін. Нярэдкія выпадкі, калі дысцыпліну, якую можна вывучыць за семестр, вывучаюць два-тры семестры. Па словах Прэзідэнта, ёсць пытанні да прафесарска-выкладчыцкага складу, да кіраўніцтва ВНУ. Ён заўважыў, што тэрміны навучання хоць і скарацілі, але замянілі гэта скарачэнне сістэмай з бакалаўрыятам. У Беларусі гэта першая ступень вышэйшай адукацыі, якая забяспечвае фундаментальную падрыхтоўку па абранай спецыяльнасці і доўжыцца чатыры гады. Пасля заканчэння бакалаўрыята выпускнік атрымлівае дыплом бакалаўра і можа ці пачынаць працаваць, ці працягваць навучанне на другой ступені вышэйшай адукацыі — у магістратуры. Гэта патрэбна, напрыклад, для тых, хто плануе займацца навуковай дзейнасцю. «Паявілыілі за кошт гэтага гадзіны і гэтак далей. Вось нам гэтым шляхам ісці не трэба. Трэба вучыцца столькі, колькі трэба. Калі належыць у ВНУ тры з паловай ці чатыры гады, значыць, чатыры. Але не шэсць, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — А то мы перажываем, што ў нас навукоўцаў няма, а ствараем нейкія бар'еры. А потым яшчэ і аспірантура для таго, каб стаць не вялікім, а звычайным навукоўцам».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў свой час катэгарычна забараніў «бегаць па нейкім Балонскім працэсе». Працягваючы тэму з тэрмінамі навучання, кіраўнік дзяржавы прывёў у прыклад Акадэмію мастацтваў, дзе па некаторых спецыяльнасцях вучацца шэсць гадоў. «Туды прыходзяць таленавітыя людзі. Трэба талент падтрымаць і развіць. Шэсць гадоў. Больш, чым некаторыя дысцыпліны ў медыцынскіх універсітэтах. Гэта што, нармальна? І што мы атрымалі? Змагарамі сталі ў 2020 годзе, наперадзе калон ішлі», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, у найбліжэйшы час гэтыя пытанні будуць абмеркаваныя.

### «УСЁ ПАВІННА БЫЦЬ ПА-ЧАЛАВЕЧЫ І НАРМАЛЬНА»

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў курсе таго, аб чым пішуць у інтэрнэце настаўнікі і выкладчыкі. Напрыклад, накont таго, што іх прымушаюць да вучняў дадому хадзіць. «Мы настаўнікі, мы выкладчыкі, нам трэба бачыць вучня і студэнта не толькі на лекцыях і ўроках. Але трэба бачыць і дома. Трэба ведаць іх бацькоў, для таго каб насяхова выкладаць», — заявіў беларускі лідар. Ён заўважыў, што ў інтэрнэце ўзнімаюць і іншыя пытанні, напрыклад, тое, што настаўнікі вымушаны запаўняць самыя розныя дакументы. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ўсе рашэнні па гэтым пытанні прынятыя і нічога на месцах выдумваць не трэба. А калі на месцах ёсць перагібы, то можна звярнуцца ў дзяржаўныя органы. «Ніякай бюракратыі быць не павінна. Усё павінна быць па-чалавечы і нармальна», — запатрабаваў ён. Прэзідэнт правёў паралель з Годам добраўпарадкавання і нагадаў, што на сваіх участках кожны павінен займацца добраўпарадкаваннем самастойна, а не пісаць у інтэрнэце, што гэта павінен зрабіць хтосьці іншы. Ці свежы прыклад — з недахопам бульбы на прылаўках. Па словах кіраўніка дзяржавы, калі б кожны на сваім участку высадзіў хоць крыху гэтай культуры — такой праблемы не было. Аляксандр Лукашэнка параіў, найперш, чым «ціктокацца» і скардзіцца ў інтэрнэце, паглядзець, што ты сам зрабіў. «Калі хтосьці не гатовы абкошваць свой участак і пяць метраў суседняга, калі там бабулька... гэта не да мяне. Я такое не вельмі разумею. Я Прэзідэнт, і мне калі трэба — абкашу, але я з касой хаджу і нічога ў гэтым ганебнага не бачу», — адзначыў ён.

Беларускі лідар параіў ніколі не забываць, што ўсюды патрэбна праца. «Не мне вам тлумачыць, вы людзі працавітыя. Вы ў Палац Незалежнасці не проста так трапілі, бо вы і вашы выкладчыкі заслужылі гэта. Я хачу, каб так было заўсёды», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

### «ТРЭБА БЫЦЬ МУДРЫМІ»

Аляксандр Лукашэнка даў параду маладым людзям: перш чым крытыкаваць кагосьці, паглядзець на сябе, ацаніць, што зрабіў, што не зрабіў, а што яшчэ трэба будзе зрабіць. «Жыццё — штука цяжкая, вельмі цяжкая. Вам 20 гадоў. Наперадзе ў вас вялізная будучыня. Недзе хутка праходзьце этапы свайго жыцця. Недзе не спяшайцеся, трэба пачакаць, трэба паглядзець, агледзецца навокал. Мы жывём у цэнтры Еўропы, і ў гэтым наша перавага і вялікая бяда, таму што на таго, хто ў цэнтры, уздзейнічаюць з усіх бакоў. Таму трэба быць мудрымі. У нас, у беларусаў, гэтага дабра хапае. Галоўнае, дзе трэба спакойна, — не спяшацца. А дзе трэба хутка (як вы цяпер, атрымаўшы адукацыю) — ідзіце хутка. Потым будзе позна», — рэзюмаваў беларускі лідар.



Фота БелТА.

лівасці, і да кожнага трэба знайсці індывідуальны падыход, аднесціся з павагай, — расказала пра сваю спецыяльнасць Дар'яна. — Я мару, каб усе дзеці ў нашай краіне маглі вучыцца, развівацца, жыць у соцыуме. А тым, у каго ёсць пэўныя асаблівасці, мы дапаможам».

**Мікалай Навіцкі** — выпускнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Ён зрабіў сваё хобі прафесіяй, Мікалай — музыкант. І, дарэчы, ужо выступаў на мерапрыемствах, што праходзілі ў Палацы Незалежнасці. «Падзяка ад Прэзідэнта дасць мне яшчэ больш матывацыі. Яна даказвае, што я іду ў правільным кірунку. Таму я і далей буду развіваць сваю канцэртную дзейнасць. У планах таксама — заняцца выкладчыцкай дзейнасцю і перадаваць любоў да музыкі беларусам», — падзяліўся Мікалай.

Год таму на экскурсіі ў Палацы Незалежнасці **Алеся Лістапад** загадала жаданне вярнуцца сюды ўжо па ўзнагароду. І жаданне спраўдзілася. Але не магічным чынам, а дзякуючы працы і мэтанакіраванасці курсанткі Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі. Дарэчы, у сваім ВНУ Алеся Лістапад — першая выпускніца, якая атрымала Падзяку Прэзідэнта. Дзяўчына расказала, што актыўна займаецца навуковай дзейнасцю. А яе галоўная навуковая праца — распрацоўка сістэмы выяўлення і процідзеяння беспілотным лятальным апаратам, якая ўкараняецца па заказе Нацыянальнага аэрапорта «Мінск».

«Мы ведаем, што пачасціліся выпадкі атак беспілотных лятальных апаратаў на аэрадромы. І стаіць вострая праблема, як абараніць аэрапорт, паколькі пры ўмяшальніцтве збоку ўзнікае шмат праблем. І паколькі Нацыянальны аэрапорт «Мінск» — самы вялікі ў краіне, самы загружаны, для яго актуальна ўстаноўка дадзенай сістэмы. Мы ў сваёй навукова-даследчай рабоце вывучаем, якая сістэма больш эфектыўная і найбольш падыходзіць для мінскага аэрапорта. Цікавая работа, яна яшчэ працягваецца. У хуткім часам прадставім вынікі», — расказала Алеся Лістапад.

Малады спецыяліст размеркавалася на малую радзіму — у Магілёў, дзе будзе працаваць у аэраклубе ДТСААФ імя Кулагіна кіраўніком палётаў. У планах таксама — магістратура і звязаць з авіяцыяй усё жыццё.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «МЫ БЫЛІ, ЁСЦЬ І БУДЗЕМ ЗАЎСЁДЫ З РАСІЯЙ»

## Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся са старшынёй Следчага камітэта Расіі Аляксандрам Бастрыкіным

Перш чым прыступіць да абмеркавання актуальных пытанняў, Аляксандр Бастрыкін уручыў беларускаму лідару ведамасны медаль «80 гадоў Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне». «Увесь савецкі народ перамог у гэтай вялікай вайне. Беларусы зрабілі вялікі ўнёсак у гэту перамогу», — падкрэсліў старшыня Следчага камітэта Расіі.

Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да Аляксандра Бастрыкіна, заўважыў: «Мы не хаваем нейкія праблемы, адкрыта іх абмяркоўваем, нават калі камусьці, можа быць, гэта не падабаецца. Я гэта вельмі цаню». Асобна Прэзідэнт падзякаваў Аляксандру Бастрыкіну за тое, што Следчы камітэт Расіі адкрыты да супрацоўніцтва з беларускімі калегамі. «Я гэта не для пратакольнай сустрэчы кажу. Вы сапраўды дапамагаеце нам па ўсіх пытаннях. Па якім бы ні звярнуліся — вы заўсёды адгукнецеся і дапаможаце. Гэта найвялікшая каштоўнасць», — адзначыў ён. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, калі б іншыя ведамствы ўзаемадзейнічалі гэтак жа як следчыя камітэты Беларусі і Расіі, то праблем бы не было.

Беларускі лідар адзначыў, што час цяпер няпросты. «Вы лепш за мяне гэта разумееце, адчуваеце, наколькі ўцягнутыя ва ўсе працэсы. Я гляджу, вы і на вызваленых тэрыторыях працу знайшлі, або даручылі вам, немалы кавалак цягнеце. І тэрарыстычныя накіраванасці нашых праціўнікаў і ворагаў — усё гэта зноў на вас кладзецца ў плане расследаванняў тых ці іншых злачынстваў на тэрыторыі Расіі, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

— Я хачу, каб вы разумелі, што ў гэты няпросты час мы з вамі. Мы гэта не хавалі, што мы з Расіяй. Мы былі, ёсць і будзем заўсёды з Расіяй. На нас вы можаце разлічваць. Натуральна, мы робім гэта акуратна, асцярожна. Нагала шашку не выхопліваем, як казакі. Але, калі ўжо выхапім, будзем змагацца, як рускія, разам з рускімі людзьмі, абараняючы нашу агульную Айчыну. Ад гэтага нікуды не дзенешся. Яна ў нас адна, іншай не будзе».

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Аляксандру Бастрыкіну за вялікі ўнёсак у развіццё адзінства Беларусі і Расіі і ўмацаванне інтэграцыі.

Старшыня Следчага камітэта Расіі праінфармаваў, што мэта яго візіту ў Мінск — рабочая нарада следчых органаў Беларусі і Расіі па актуальных крымінальных справах. Ён расказаў, што яны актыўна працуюць разам з беларускімі калегамі: «Дзейнічае наша сумесная следча-аператыўная група па расследаванні генацыду беларускага і расійскага народаў. Гэта работа актыўна працягваецца. Мы ўдзячныя нашым беларускім калегам за тое, што яны даюць нам вельмі шмат матэрыялаў з архіваў. Мы праводзім сумесныя мерапрыемствы і на тэрыторыі Расіі, і на тэрыторыі Беларусі. І дзякуючы ў тым ліку падтрымцы беларускіх калег у Расіі вынеслі ўжо 34 прыгаворы, якія прызналі дзеянні фашыстаў генацыдам».

### Даслоўна

### «Мы гатовы дзяліцца сваім досведам з беларускімі калегамі»

Журналістам старшыня Следчага камітэта Расіі расказаў, што на сустрэчы з беларускім лідарам абмеркавалі сумесны вопыт барацьбы з нелегальнай міграцыяй, што для Расіі застаецца актуальнай праблемай. «Я далажыў аб удзеле Следчага камітэта ў расследаванні злачынстваў кіеўскага рэжыму ў рамках спецыяльнай ваеннай аперацыі. Гутарка была вельмі цікавай, шчырай і вельмі для мяне карыснай», — заявіў Аляксандр Бастрыкін. Ён таксама расказаў, што ў Мінску паўдзельнічае не толькі ў рабочай нарадзе, але і ў міжнароднай канферэнцыі па актуальных праблемах крыміналістыкі, крымінальнага права і крымінальнага працэсу.



«Дарыць свой вопыт заходнім калегам мы не хочам. Я прыхільнік таго, каб мы стварылі свае айчынныя метады лічбавага раскрыцця злачынстваў, лічбавыя тэхналогіі. А вось з беларускімі калегамі мы цалкам адкрытыя ў гэтым плане, абменьваемся вопытам па поўнай праграме», — падкрэсліў старшыня Следчага камітэта Расіі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# АРЭНДНАЕ ЖЫЛЛЁ МОЖНА НАБЫЦЬ ВА ЎЛАСНАСЦЬ

## Прэзідэнт падпісаў адпаведны ўказ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 19 чэрвеня падпісаў Указ № 235, накіраваны на пашырэнне сацыяльна-прававых гарантый у галіне жыллёвых адносін грамадзян з прадастаўленнем ім права набыцця ва ўласнасць арэнднага жылля, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

**Грамадзянам найбольш запатрабаваных прафесій будзе прадастаўляцца права набываць ва ўласнасць арэнднае жыллё ў населеных пунктах з колькасцю насельніцтва да 20 тысяч чалавек (акрамя Мінскага раёна) пры пэўных умовах.**

Такое набыццё будзе магчыма, у прыватнасці, пры наяўнасці асноў для прызнання грамадзян маючымі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, стажу працы ў арганізацыі, якая дала жыллё, і тэрміну пражывання ў такім жыллі не менш за 10 гадоў, а таксама невыкарыстанні названымі грамадзянамі і членамі іх сем'яў дзяржаўнай падтрымкі пры ўзвядзенні, рэканструкцыі або набыцці жылля, адсутнасці ў іх іншых жылых памяшканняў ва ўласнасці ў населеным пункце па месцазнаходжанні арэнднага жылля альбо фактаў іх адчужэння на працягу трох гадоў.

**Аплату кошту арэнднага жылля можна будзе зрабіць у растэрміноўку на 15 гадоў, а таксама выкарыстоўваць на гэтыя мэты імянныя прыватызацыйныя чэкі «Жыллё» і сродкі сямейнага капіталу.**

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, дзяржаўныя органы (арганізацыі) будуць надзелены правам перадачы ва ўласнасць наймальнікаў размешчаных на сяле аднакватэрных жылых дамоў, кватэр у блакіраваных жылых дамах дзяржаўнага жылога фонду, што эксплуатуюцца больш за 10 гадоў і патрабуюць капрамонту. Пры гэтым такое жыллё, прадастаўленае на час працоўных адносін, можа быць перададзена ва ўласнасць грамадзян, якія маюць стаж працы не менш за 5 гадоў у арганізацыі, што выдзеліла жылое памяшканне.

**Прадастаўленне арэнднага жылля стала адной з тэм нарады Аляксандра Лукашэнкі з кіраўніцтвам Савета Міністраў 29 мая. Прэзідэнт падкрэсліў, што гэта пытанне павінна стаць адным з прыярытэтаў на пяцігодку.**

«У будучым годзе мы выйдзем да беларусаў з праектам праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця, які будзе разгледжаны на Усебеларускім народным сходзе. Да гэтай сустрэчы трэба дакладна і зразумела адрэгуляваць усе палажэнні: дзе, хто, наколькі хутка і на якіх умовах можа прэтэндаваць на арэнднае жыллё, а з часам набыць яго па жаданні ва ўласнасць. Прычым нават у растэрміноўку», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# СУМЕСНЫЯ ПРАЕКТЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ НА ЎЗРОЎНІ

Беларусь зацікаўлена ў развіцці партнёрства з кітайскай карпарацыяй CITIC Group. Аб гэтым заявіў Прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр ТУРЧЫН падчас сустрэчы са старшынёй Савета дырэктараў карпарацыі CITIC Group Сі Гохуа.

«Кітай для нас не проста дзяржава ў спісе гандлёва-эканамічных партнёраў. Кітай — наш жалезны брат, на якога мы можам разлічваць нават у самыя складаныя часы», — заўважыў Аляксандр Турчын. Ён адзначыў, што ў Беларусі з вялікай павагай ставяцца да CITIC Group — карпарацыі, заснаванай у 1979 годзе. «Кампанія, першапачаткова арыентаваная на прыцягненне замежных інвестыцый у Кітай, сёння з'яўляецца глабальным гульцом, які ўваходзіць у лік 500 буйнейшых брэндаў свету. Мы высока цэнім ваш вопыт работы і значную колькасць сумесных праектаў. Толькі з Прэзідэнтам нашай краіны кіраўніцтва вашай карпарацыі сустракалася сем разоў, што сведчыць аб высокім узроўні даверу і зацікаўленасці ў далейшым развіцці нашага партнёрства», — перакананы Прэм'ер-міністр.

На яго думку, трэба выходзіць на новы, больш складаны ўзровень супрацоўніцтва. «Праведзена вялікая работа, але мы, упэўнены, можам больш. Сумесныя праекты Беларусі і Кітая павінны адпавядаць узроўню, устаноўленаму кіраўнікамі нашых дзяржаў, — узроўню ўсепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства. У жніўні мінулага года адбыўся афіцыйны візіт Прэм'ера Дзяржаўнага савета КНР Лі Цяна ў Беларусь, у рамках якога мы вызначылі ключавыя задачы ўрадаў дзвюх краін на найбліжэйшую перспектыву. Сярод найбольш перспектыўных і неабходных для нашай краіны (задач. — **«Зв.»**) — развіццё прадукцыйных сіл новай якасці, пашырэнне навукова-тэхнічных інавацый, стварэнне новых галін прамысловасці і мадэрнізацыя дзейных. На мой погляд, нам трэба разам з карпарацыяй CITIC выходзіць на новы ўзровень. Не толькі якасна і добра будаваць, рэалізоўваць праекты, але і пераходзіць да больш складаных форм супрацоўніцтва», — падкрэсліў кіраўнік беларускага ўрада.



Учора Аляксандр Турчын таксама правёў сустрэчу з ганаровым консулам Рэспублікі Беларусь у Люцэрне Германам Александэрам Бейелерам. Падчас сустрэчы былі абмеркаваныя двухбаковае супрацоўніцтва і рэалізацыя сумесных праектаў у вобласці аховы здароўя і спорту, паведамілі ў прэс-службе ўрада.

НА СЛЫХУ

# ЦЭНЫ — ПАД АСАБЛІВЫ КАНТРОЛЬ

## Не дапусціць спекуляцыйнага і неабгрунтаванага росту

Урад узяў на асаблівы кантроль цэнаўтварэнне на мяса-малочную прадукцыю і кандытарскія вырабы. Адпаведную пастанову напярэдадні падпісаў Прэм'ер-міністр Беларусі. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе ўрада.

Як вядома, у красавіку ўрад даў магчымасць вытворцам права самастойна павышаць адпускныя цэны. Многія, у каго была неабходнасць палепшыць сваё фінансавае становішча, гэтым правам скарысталіся. З 20 чэрвеня ў мэтах недапушчэння спекуляцыйнага і неабгрунтаванага росту цэн урадам узяты на кантроль працэс павышэння вытворцамі цэн на мяса-малочную групу тавараў і кандытарскія вырабы. Як адзначыў **першы намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Іван ВЕЖНАВЕЦ,** гэтыя пазіцыі можна назваць найбольш «інфлятагеннымі» за апошнія гады, паведаміла БелТА.

Далейшае павышэнне цэн на такія тавары звыш 0,3 працэнта ў месяц неабходна абгрунтаваць Камісіі па пытаннях дзяржаўнага рэгулявання цэнаўтварэння пры Савеце Міністраў. Пры гэтым на кантроль узяты цэны па ўсім ланцужку — ад сельскагаспадарчага вытворцы да розніцы, гэта значыць, аргументаваць камісіі цяпер неабходна таксама павышэнне цэн на малака-сыравіну, свіней, буйную рагатую жывёлу, якія пастаўляюцца для перапрацоўкі. У розніцы прадаўжаюць дзейнічаць гранічныя надбаўкі.

**Меры, якія прымаюцца, лічыць першы намеснік міністра, умацуюць стабільнасць на харчовым рынку, паколькі вытворцы названых груп тавараў абавязаны будуць ініцыяванае павышэнне цэн звыш нарматыву ўзгадніць, іншымі словамі, дынаміка цэн будзе кантралявацца дзяржавай. Разам з тым, паводле ацэнкі спецыяліста, і да прынятых мер масавага росту цэн на беларускім харчовым рынку рэгулятары не назіралі. Глабальных скачкоў цэн не дапусціла канкурэнцыя за спажыўца з замежнымі, у асноўным расійскімі, вытворцамі.**



«Як паказвае практыка, з 2022 года, калі была прынята пастанова Савета Міністраў № 713 «Аб сістэме рэгулявання цэн», мы з перыядычнасцю ўносім змяненні ў парадак цэнаўтварэння. На гэты момант з'явілася неабходнасць карэкціроўкі падыходаў да цэнаўтварэння па мяса-малочнай групе і кандытарскай прадукцыі, — растлумачыў Іван Вежнавец. — Калі перадумовы будуць складвацца па іншых таварных групах, рашэнні будуць прымацца».

Неабходнасць гэтага падкажа аналіз на аснове шэрагу фактараў, у першую чаргу разгляд афіцыйных статыстычных даных узроўню інфляцыі і тэмпаў росту цэн на адпаведныя тавары і пазіцыі. Акрамя таго, супрацоўнікі МАРГ штодзённа ўзаемадзейнічаюць з гандлёвымі сеткамі і вытворцамі, і ў выпадку абазначэння негатыўных тэндэнцый — рэагуюць.

У цэлым сітуацыю на беларускім спажывецкім рынку Іван Вежнавец ахарактарызаваў як стабільную. На паліцах прысутнічае дастатковы асартымент тавараў, пры гэтым узровень цэн знаходзіцца ў зададзеных рамках. Пра асобныя факты парушэнняў становіцца вядома падчас кантрольна-аналітычных мерапрыемстваў, але неадпаведнасці не масавыя.

АКЦЭНТЫ

# СТАЛІЦА ПАВІННА ПАДАВАЦЬ ПРЫКЛАД

## Зроблена шмат, але ёсць нявырашаныя пытанні

Тыя задачы, якія сёння стаяць перад кіраўніцтвам мясцовых органаў улады і дэпутацкім корпусам, павінны вырашацца аператыўна, а выканаўчая дысцыпліна павінна знаходзіцца на самым высокім узроўні, звярнула ўвагу Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў горадзе Мінску Наталля КАЧАНАВА перад сустрэчай з кіраўнікамі раёнаў сталіцы.

У фокусе ўвагі на такіх сустрэчах, паводле яе слоў, пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця, выканання прагнозных паказчыкаў, своечасовай выплаты заработнай платы, работы праблемных прадпрыемстваў, навядзення парадку на зямлі, што асабліва важна ў аб'яўлены Прэзідэнтам Год добраўпарадкавання.

— Сустрэчы з кіраўніцтвам горада, з кіраўнікамі адміністрацыі раёнаў сталі ўжо традыцыйнымі, — адзначыла Наталля Качанава. — Іх мы праводзім досыць часта, таму што ў нашай краіне дзейнічае інстытут упаўнаважаных Прэзідэнта Беларусі, якія працуюць ва ўсіх абласцях нашай краіны і Мінску. Так, горад прыгожы, і зроблена вельмі шмат. Але мы разумеем, што ёсць яшчэ пытанні, якія неабходна вырашаць. Трэба зайсці ў кожны двор, убачыць, як вырашаюцца пытанні на дваровых тэрыторыях. Гэта датычыцца і азелянення, і своечасовасці вывазу смецця, і шэрагу іншых кропкавых пытанняў. Сітуацыя рэгулярна маніторыцца, мы стараемся яе вырашаць, але рабіць павінны гэта больш аператыўна.

Паводле слоў спікера, на такіх сустрэчах абавязкова разглядаюцца і пытанні эфектыўнасці ідэалагічнай работы ў працоўных калектывах, работы з людзьмі: «Гэта вельмі важна! Я заўсёды кажу: у інфармаванага чалавека ўзнікае менш пытанняў. Таму з сустрэчамі ў працоўных калектывах, прыёмамі па асабістых пытаннях, вырашэннем тых праблем, з якімі звяртаюцца людзі і ў Савет Рэспублікі, і ў мясцовыя органы ўлады, нельга зацягваць. І калі чалавек звяртаецца з пытаннем, якое не супярэчыць закону, яму абавязаны аказаць дапамогу».

Не менш важным з'яўляецца і пытанне забеспячэння эфектыўнасці работы прадпрыемстваў сталіцы.

**«На кожным прадпрыемстве павінны быць дастойныя ўмовы працы для работнікаў, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Людзі павінны адчуваць клопат пра сябе. І таму асаблівая ўвага ўдзяляецца рабоце прадпрыемстваў, прычым усё роўна, якой формы ўласнасці. Як адзначыў Прэзідэнт, гэта ўсе нашы, дзяржаўныя прадпрыемствы, на іх працуюць нашы людзі. Таму кожнае з іх неабходна трымаць на кантролі».**

Наталля Качанава адзначыла, што ў Мінску штогод праводзіцца вялікая колькасць розных мерапрыемстваў: «Толькі за мінулы год іх было праведзена (на рэспубліканскім і мясцовым узроўнях) больш за чатыры тысячы. Арганізацыя ўскладзена на мясцовыя органы ўлады. Менавіта яны абавязаны зрабіць усё, каб кожнае мерапрыемства прайшло бяспечна і камфортна для людзей. І зусім хутка пройдзе Еўразійскі эканамічны форум, які стане яшчэ адным найважнейшым выпрабаваннем для гарадскіх службаў. Словам, мы павінны ўвесь час трымаць руку на пульсе і не дапускаць збояў».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# ЧЫМ ЖЫВЕ ШУМІЛІНСКІ РАЁН?

## Занятасць насельніцтва, нарыхтоўка кармоў, эфектыўнасць работы прадпрыемстваў

Старшыня Палаты прадстаўнікоў, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Віцебскай вобласці Ігар СЕРГЯЕНКА наведаў з рабочай паездкай Шумілінскі раён.

Ён усклаў кветкі да воінскіх могілак і ўзяў удзел у пасяджэнні Шумілінскага райвыканкама. На парадку дня два асноўныя пытанні — рэалізацыя норм Дэкрэта Прэзідэнта «Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва» і падрыхтоўка ўстаноў адукацыі раёна да новага навучальнага года. Акрамя таго, спікер Палаты прадстаўнікоў сустрэўся з калектывамі двух прадпрыемстваў Шумілінскага раёна і адказаў на пытанні работнікаў, а таксама азнаёміўся з сацыяльна-эканамічным становішчам гэтых вытворчасцяў.

Напярэдадні Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа Ігар Сергяенка разам з прадстаўнікамі мясцовых органаў улады і грамадскасці гарадскога пасёлка Шуміліна ўшанаваў памяць савецкіх воінаў, партызан і мірных жыхароў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Кветкі ад спікера Палаты прадстаўнікоў ляглі да помніка, усталяванага на вайсковых могілках. Пахаванне, даручы, занесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў.

На пасяджэнні Шумілінскага райвыканкама Ігар Сергяенка падкрэсліў, што асноўная мэта яго візіту — комплекснае вывучэнне сітуацыі ў рэгіёне. Такую работу ўпаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў вобласці праводзіць на пастаяннай аснове ва ўсіх раёнах. Ён звярнуў увагу на сітуацыю з працоўнымі рэсурсамі, працэсы нарыхтоўкі кармоў у існуючых умовах, эфектыўнасць работы прадпрыемстваў, а таксама ў цэлым на развіццё гарпасёлка.

На разгляд было вынесена і пытанне аб ходзе падрыхтоўкі навучальных устаноў раёна да новага навучальнага года. Ігар Сергяенка пацікавіўся, ці ўсе школы маюць прысядзібныя ўчасткі, ці паспеюць адрамантаваць школу, якая мае патрэбу ў капітальным рамонце, і за кошт чаго мэтавы набор на педагагічныя спецыяльнасці ў раёне вырас з 9 да 23 чалавек.

**Спікер Палаты прадстаўнікоў падкрэсліў, што пры падрыхтоўцы да навучальнага года важна ўлічыць не толькі стан матэрыяльна-тэхнічнай базы, але і іншыя аспекты забеспячэння адукацыйнага працэсу.**

З педагагічнай грамадскасцю Шуміліна Ігар Сергяенка абмеркаваў прапанаваныя змены ў законы аб абароне правоў дзіцяці.

Пасля Старшыня Палаты прадстаўнікоў наведаў Шумілінскую ПМК-70. Візіт на прадпрыемства стаў незапланаваным пунктам у маршруце. Падчас пасяджэння Шумілінскага райвыканкама кіраўнік ПМК-70 Аляксей Крыўко далажыў аб тым, як будаўнічая арганізацыя наладзіла працу з кадрамі. Спікер Палаты прадстаўнікоў прыняў рашэнне наведаць прадпрыемства. Яно ўжо больш за 50 гадоў паспяхова працуе на будаўнічым рынку і з'яўляецца адной з вядучых будаўнічых арганізацый рэгіёна. За гады сваёй дзейнасці выканала мноства будаўнічых работ у жыллёвым і сацыяльным сектарах, у тым ліку ў аграгарадках.

Яшчэ адзін пункт у праграме рабочага візіту Ігара Сергяенкі — сустрэча з працоўным калектывам аднаго з буйных прадпрыемстваў раёна, Обальскага керамічнага завода. Менавіта тут рэалізуецца інвестыцыйны праект па вытворчасці новых відаў цэглы з выкарыстаннем цвёрдых відаў паліва ў рамках праграмы «Адзін раён — адзін праект». Падчас сустрэчы размова ішла аб бягучай грамадска-палітычнай абстаноўцы ў краіне і свеце, дзейнасці Палаты прадстаўнікоў і заканадаўчых ініцыятывах дэпутатаў. Супрацоўнікі прадпрыемства адрасавалі Ігару Сергяенку шэраг пытанняў аб бягучым стане спраў на прадпрыемстве і яго перспектывах.

**Паводле прэс-службы Палаты прадстаўнікоў.**

## Извещение о наличии оснований для признания квартиры в блокированном жилом доме пустующей

Поплавский сельский исполнительный комитет извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлена квартира в блокированном жилом доме, расположенная по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Негоничи, ул. Полевая, дом 8, квартира № 3**

(полный адрес указан согласно похозяйственным книгам), имеющая основания для признания ее пустующей.

Сведения о квартире № 3 в блокированном жилом доме (из акта):

Наружные размеры квартиры в блокированном жилом доме: 6 х 6,5 м.

Площадь: 39,0 кв. м.

Дата ввода в эксплуатацию блокированного жилого дома: 1958.

Материал стен : бревенчатый

Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель, квартира частично сгоревшая, хозяйственные строения разрушены.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно квартира в блокированном жилом доме принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): Уткина Светлана Яковлевна, умершая 28.03.2017 года.

Предположительный срок непроживания в квартире собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этой квартирой: более 10-ти лет.

От лиц, имеющих право пользования квартирой, в Поплавский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такую квартиру для проживания.

Поплавский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Поплавский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующую квартиру для проживания.

**Телефоны для справок:**
**801715-6-3-818, 801715-63-821, 801715-63-8-25**

## О поиске правообладателей квартиры в блокированном жилом доме

д. Негоничи
Березинского района Минской области

Поплавский сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования квартирой в блокированном жилом доме: **Минская область, Березинский район, д. Негоничи, ул. Полевая д. 8, кв. 3.**

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках о месте их фактического проживания либо месте нахождения, сообщить в Поплавский сельисполком по телефонам: 801715-63818,801715-63821 (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням), в любое время 8029 -7002212. Информацию также можно прислать по адресу : 223334, аг. Поплавы, ул. Октябрьская, д. 2, Минская область.

Электронный адрес: poplavss@berezino.gov.by

## Извещение о наличии оснований для признания квартиры в блокированном жилом доме пустующей

Поплавский сельский исполнительный комитет извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлена квартира в блокированном жилом доме, расположенная по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Негоничи, ул. Полевая, дом 8, квартира № 1**

(полный адрес указан согласно похозяйственным книгам), имеющая основания для признания ее пустующей.

Сведения о квартире № 1 в блокированном жилом доме (из акта):

Наружные размеры квартиры в блокированном жилом доме: 6 х 6,5 м.

Площадь: 39,0 кв. м.

Дата ввода в эксплуатацию блокированного жилого дома: 1958.

Материал стен : бревенчатый.

Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель, квартира частично сгоревшая, хозяйственные строения разрушены.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно квартира в блокированном жилом доме принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): Ковалевский Василий Федорович, умерший 20.10.2020 года.

Предположительный срок непроживания в квартире собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этой квартирой: более 10-ти лет.

От лиц, имеющих право пользования квартирой, в Поплавский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такую квартиру для проживания.

Поплавский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Поплавский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующую квартиру для проживания.

**Телефоны для справок:**
**801715-6-3-818, 801715-63-821, 801715-63-8-25**

## О поиске правообладателей квартиры в блокированном жилом доме

д. Негоничи
Березинского района Минской области

Поплавский сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования квартирой в блокированном жилом доме: Минская область, Березинский район, д. Негоничи, ул. Полевая, д. 8, кв. 1.

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках о месте их фактического проживания либо месте нахождения, сообщить в Поплавский сельисполком по телефонам: 8 017 15-63818, 8 017 15-63821 (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням), в любое время 8 029 700-22-12 .Также информацию можно прислать по адресу: 223334, аг. Поплавы, ул. Октябрьская, д. 2, Минская область.

Электронный адрес: poplavss@berezino.gov.by

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению открытого акционерного общества **«Смолевичский райагросервис» (продавец),** проводит открытый аукцион по продаже

## здания конторы

*(составные части и принадлежности: 2 (два) крыльца)* **с инв. № 614/С-33098 общей площадью 366,8 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624884507601000143 площадью 0,0853 га** *(право постоянного пользования)*, **по адресу: Минская область, Смолевичский район, Плисский с/с, п. Черницкий.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона теплотрассы, пл.0,0152 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 48 450,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 4 845,00** бел. руб.). **Стоимость снижена на 5 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 25.04.2025.

Аукцион состоится **10.07.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.07.2025** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17. Тел. для осмотра: 8 (044) 145-17-40.**

УНН 600048461



## ООО «Фрондера»
извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества
## ООО «Профитсистем»

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. (10 %) | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 2113 | Имущество, согласно списку № 1: https://orgtorg.by/upload/doc/profitsistem/2113.pdf | Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Загородная, 3Б | 3 429,60 | 342,96 | 171,48 |
| В отношении лота проводятся первые торги | | | | | |
| **Дата и время проведения торгов** | **24 июля 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 | | | | |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 23 июня 2025 года до 16.00 22 июля 2025 года | | | | |

**Условия для участия в торгах:** 1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901, Задаток для участия в торгах по Лоту № 2113, ООО «Профитсистем», проводимых 24.07.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 9 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов осуществляется согласно договору купли-продажи, но не позднее 14 (четырнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте: https://orgtorg.by.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **тел. +375295295202 Сергей (пн-пт с 10.00 до 13.00).**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | ООО «Профитсистем», в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375173958917 (220040, г. Минск, ул. Достоевского, 27) |
| **Организатор аукциона** | ООО «Фрондера» 220113 г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: • 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg |


ЭКАНОМІКА

# СТАЎКІ СУПРАЦЬ РОСТУ?

## Кіраўнік Нацбанка: вопыт расійскіх калег у грашова-крэдытнай палітыцы карысны для нас, бо эканомікі падобныя

Пра гэта заявіў старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА пасля ўдзелу ў бізнес-сняданку са Сбербанкам, які традыцыйна праводзіцца ў рамках Пецярбургскага эканамічнага форуму. Сёлета тэма была вельмі актуальная: «Стаўкі супраць росту: які будзе найбліжэйшы год?». Наколькі гэта цікава для Беларусі — у нашым матэрыяле.



На думку Рамана Галоўчанкі, мерапрыемства было вельмі значнае і статуснае зыходзячы з узроўню ўдзельнікаў:

— Напэўна, палова членаў урада Расіі прысутнічала, найбуйнейшыя прадпрымальнікі, замежныя госці. Гэта сведчыць аб той увазе, якая ўдзяляецца ў расійскай экспертнай супольнасці, ва ўрадавых, дзелавых колах, асноўнаму пытанню, што цяпер актыўна абмяркоўваецца на самых розных пляцоўках (ад вышэйшых эшалонаў улады да спецыялістаў, экспертаў, эканамістаў), — пошук разумнага балансу паміж эканамічным ростам і грашова-крэдытнай палітыкай.

Спікер падкрэсліў актуальнасць гутаркі:

— Не сакрэт, што тэма вельмі актыўна дэбатуецца, таму што ўсё часцей і часцей гучаць пасылы аб тым, што расійская эканоміка не проста запавольваецца, а знаходзіцца на мяжы рэцэсіі, прычым з даволі працяглым прагназавальным тэрмінам. Таму неспакой існуе. І, вядома, цяпер актыўна ідзе выпрацоўка далейшых крокаў, каб не дапусціць ператварэння мяккай пасадкі, як той казаў, у жорсткую і згасання. Таму адсюль і вялікая цікавасць, і такая колькасць часта палярных меркаванняў, вельмі вострая дыскусія.

# АБ САМЫХ СМАЧНЫХ ДРАНІКАХ




Пераможцы конкурсу — сям'я АЛЯХНОВІЧ з Нясвіжскага раёна.

Як паведаміла **першы сакратар Мінскага абласнога камітэта ГА «БРСМ» Таццяна КЛІШЭВІЧ**, гэтым разам у абласным этапе рэспубліканскага сельскагаспадарчага праекта «Уладар сяла» ўдзельнічалі 17 сем'яў з розных рэгіёнаў Міншчыны. Сёлетні конкурс, як правіла, традыцыйнага фармату. «Але менавіта самі падворкі мы стараемся мяняць у адпаведнасці з пазначаным годам. То-бок у нас 80-годдзе Перамогі і Год добраўпарадкавання, таму асноўны акцэнт быў зроблены на гэтым».

Сем'і-ўдзельніцы з розных куткоў цэнтральнага рэгіёна атрымалі выдатную магчымасць пабываць у Валожыне, які летась істотна абнавіўся да фестывалю працаўнікоў вёскі «Дажынкі». Іх імправізаваныя падворкі пад адкрытым небам цэлым гарадком раскінуліся па вуліцы Партызанскай. Перад конкурсам мы пазнаёміліся з некаторымі.

### «НАМ НІКОЛІ НЕ БЫВАЕ СУМНА»

Сярод удзельнікаў вылучалася самая шматлікая **сям'я Аляхновічаў з Нясвіжскага раёна**, якая выхоўвае шасцярых дзяцей: пяцёра хлапчукоў і дачку. «Мы вельмі рады ўдзельнічаць у такім выдатным праекце. Многія думаюць, што жыццё ў вёсцы — гэта вымірающая тэндэнцыя. Але гэта зусім не так! Цяпер маладых сем'яў хапае ў вёсках. Магчымасці ёсць, трэба толькі жаданне. Мы працуем на зямлі і жывём каля лесу. Нам вельмі добра і ніколі не бывае сумна!», — дзеліцца сваімі ўражаннямі мама Паліна.

«Мы вырошчваем агуркі, памідоры, зеляніну ўсякую. У нас вялікі агарод — 60 сотак!» — дадае тата Яўген. Ён расказаў, што паўдзельнічаць у сямейным конкурсе ім прапанавалі ў сельсавеце: «У нас вялікая і дружная сям'я, дзе кожны адзін за аднаго стаіць гарой. А яшчэ — асабістая падсобная гаспадарка. Толькі на гэтым і жывём, і зарабляем. У нашай краіне створаны ўсе ўмовы, каб добра жыць на вёсцы ды займацца фермерствам».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

### «МЫ З УСІМ АБАВЯЗКОВА СПРАВІМСЯ!»

Ужо не першы раз удзельнічае ў абласным конкурсе **сям'я Папікян з Крупскага раёна.** З імі карэспандэнты «Звязды» пазнаёміліся яшчэ летась таксама на абласным этапе конкурсу. Тады дружная сям'я заняла ганаровае трэцяе месца. На гэтым маладыя людзі вырашылі не спыняцца. «Летась мы ўдзельнічалі ўпершыню, было напружана і нават рызыкоўна, вельмі перажывалі, — дзеліцца ўспамінамі галава сямейства Каруш. — Тады занялі трэцяе месца, але гэтым разам будзем імкнуцца стаць найлепшымі! Прыехалі ў Валожын з баявым настроі! У нас дружная і вясёлая сям'я. Вядома, дачка трохі саромеецца, ды і надвор'е не зусім камфортнае, але мы з усім абавязкова справімся! Нягледзячы на ўсё, тут, у Валожыне, пануе вельмі дружная атмасфера».

Каруш працуе леснікам, яго жонка Анастасія — прадаўцом у краме. Дачка Сафія 1 верасня пойдзе ў першы клас. «Яна вельмі хацела прыехаць на конкурс, таму мы і пастараліся знайсці час, прадставіць гасцям і членам журы наш цудоўны падворак, наш раён. Ну і, вядома ж, вызначыцца, паспяхова паўдзельнічаць у конкурсах. Трохі перажываю наконт спавівання малога, даўно гэта было, але рукі яшчэ памятаюць. Падрыхтаваліся да колкі дроў, завастрылі пілу, узялі добрую сякеру. Лічым, што падрыхтаваліся добра, зыходзячы з вопыту мінулага года. Цяпер мы ўжо ведаем, што чакае нас наперадзе. І самае цікавае — прыгата-



Сям'я ПАПІКЯН з Крупскага раёна.

На думку кіраўніка Нацбанка, беларускую эканоміку яна наўпрост не закранае, але тым не менш тэма для нас актуальнасці не страчвае:

— Вельмі шмат важнага можна падкрэсліць, таму што з тых фактараў, якія называюцца ў якасці ключавых, якія нясуць самыя сур'ёзныя рызыкі для росту расійскай эканомікі, ёсць і сугучныя нашым праблемам.

Раман Галоўчанка агучыў асноўныя тры ключавыя фактары:

— Іх шмат называлася, сярод удзельнікаў нават было праведзена анлайн-галасаванне адносна таго, што яны лічаць самым няпростым або самым складаным. У прынцыпе, для нас гэта таксама актуальна. Першы — дэфіцытны рынак працы і вельмі напружаная сітуацыя на рынку працы, якая правакуе бескантрольны рост заработных плат і так званую вайну за персанал. Другі фактар — абмежаванне доступу (або недастаткова свабодны доступ) да сучасных тэхналогій і, адпаведна, недастатковая прадукцыйнасць працы. І трэці — ключавая стаўка Банка Расіі, якая вызначае ўмовы крэдытавання эканомікі.

Спікер адзначыў, што вакол гэтых трох фактараў і канцэнтравалася гутарка:

— Першыя два для нас таксама актуальныя, мы часта звяртаем на іх увагу, але не проста канстатуючы, што яны існуюць, а ў кантэксце таго, што трэба знаходзіць і выпрацоўваць рашэнні, каб знівеліраваць уплыў гэтых фактараў.

Раман Галоўчанка заўважыў, што гатовага рэцэпта падчас бізнес-снядання знойдзена не было, але агучаныя довады і аргументы вельмі карысныя і для беларускага боку ў выпрацоўцы ўласных крокаў, і растлумачыў чаму:

— Структура эканомікі ў нас дастаткова падобная, за выключэннем, напэўна, горназдабываючай і энергетычнай сфер. Таму асабіста для сябе пэўныя высновы зрабіў.

Ён вельмі даходліва растлумачыў сутнасць грашова-крэдытнай палітыкі і яе ўплыву на эканоміку:

— Калі спрошчана ўявіць і параўнаць яе з нейкім кранам або вентылем, што стаіць на трубе і палівае нейкія расліны, якія яшчэ не набралі дастатковага росту. Калі закруціць вентыль — расліны засохнуць. Калі ж яго моцна адкрыць — струмень вады ўсё змые. Таму пошук аптымальнага балансу — вельмі складаная кіраўнічая задача для дзяржаўных органаў, фінансавага і эканамічнага блокаў.

Кіраўнік Нацбанка канстатаваў, што падчас праведзенага бізнес-снядання атрымаў дастатковую колькасць новай інфармацыі:

— Больш выразна бачу, якіх вострых вуглоў мэтазгодна пазбегнуць у правядзенні нашай уласнай грашова-крэдытнай і бюджэтнай палітыкі.

У завяршэнне ён дадаў, што грашова-крэдытная палітыка — велічыня непастаянная, яна змяняецца зыходзячы з фактараў, якія маюцца на рынку:

— Таму сёлета, магчыма, давядзецца прымаць пэўныя рашэнні ў той ці іншы бок. Але зноў-такі вопыт нашых расійскіх калег вельмі карысны ў гэтым.

**Маргарыта ЗАРОЎКІНА.**

# І САМЫХ МОЦНЫХ СЕМ'ЯХ



Сям'я ЛІННІК з Капыльскага раёна.




ваць найсмачнейшыя дранікі. Гэта мы любім, умеем, практыкуем!»

## «ГАЛОЎНАЯ АПОРА — ДЗЕЦІ»

**Сям'я Ліннік з Капыльскага раёна** таксама ўдзельнічала ў праекце летась. Арцём працуе трактарыстам, яго жонка Надзея — аператарам машыннага даення, дзве дачкі — Мілана і Валерыя — яшчэ вучацца ў школе. «Мы — звычайная сям'я з вёскі, трымаем сваю падсобную гаспадарку. У нас ёсць авечкі, свінні, індыкі і куры, садзім агарод, з якога робім нарыхтоўкі. Летась, на жаль, удача крыху адвярнулася ад нас, але гэтым разам мы прыехалі, каб перамагчы. Да конкурсаў цалкам гатовыя, паколькі яны з'яўляюцца неад'емнай часткай нашага паўсядзённага жыцця. Секчы дровы, смажыць дранікі, збіраць агародніну і бегаць з каляскай — мы ўпэўненыя, што годна справімся з усімі выпрабаваннямі! Галоўную апору і падтрымку бачым і знаходзім у сваіх дзецях. З імі нам і горы ні па чым!»

## ЦВІК ЗАБІЦЬ — ГЭТА ВАМ НЕ ДЗІЦЯ СПАВІЦЬ

Удзельнікаў чакала насычаная праграма, адметнасцю якой стаў конкурс «Сардэчна запрашаем да нас!» У гэтым творчым спаборніцтве сем'і прадставілі свае ўнікальныя тэатралізаваныя паказы, расказваючы пра сямейныя традыцыі, захапленні і сваякоў. Бацькі і дзеці дэманстравалі свае таленты: спявалі народныя песні, танцавалі, ігралі на музычных інструментах і чыталі вершы. Адчувалася, што кожнае выступленне было напоўнена душэўнасцю і любоўю да сваёй сям'і і роднага краю.

Наступнае выпрабаванне «Працуем у камандзе» складалася з чатырох этапаў, дзе адначасова ўдзельнічалі дзве сям'і. Тут удзельнікі праявілі сябе сапраўднымі майстрамі на ўсе рукі: спрытна кіравалі тачкай, хутка забівалі цвікі і пяшчотна спавівалі ляльку, нібы нованароджанае немаўля.

Не менш відовішчным стаў конкурс «Па дровах», дзе сем'і павінны былі прадэманстраваць сваю сілу і ўменне, распілоўваючы бервяно ручной пілой на казлах, а затым секчы дровы. Завяршальным выпрабаваннем спрыту і майстэрства стаў этап «На ўсе рукі майстар». У гэтым конкурсе крэатыўныя мамы і таты плялі вянкі з падручных матэрыялаў, дэманструючы свае майстэрства і фантазію.

Цвіком праграмы сталі «Дранікі на калодзе», дзе ўдзельнічалі ўсе сем'і адначасова. Кожная каманда прадэманстравала свае кулінарныя таленты, гатуючы традыцыйную беларускую страву.

* * *

Пераможцамі спаборніцтваў стала сям'я Аляхновічаў з Нясвіжскага раёна. Яны прадстаўляць Міншчыну на рэспубліканскім этапе конкурсу ў Александрыі, а яшчэ атрымалі ў якасці прыза цяля. Другое месца ў абласным этапе конкурсу заняла **сям'я Аляксандра і Наталлі Лапаткіных са Старадарожскага раёна** — іх гаспадарка папоўніцца парасём. Заключыла тройку прызёраў **сям'я Андрэя і Кацярыны Юркевічаў з Валожынскага раёна** — у іх прыбудзе ў птушніку. Пераможцамі анлайн-галасавання сталі ўдзельнікі **з Клецкага раёна — сям'я Андрэя і Крысціны Аляксейчык з дочкамі Ксеніяй і Дарынай** — ім уручылі веласіпед.

**Даніiл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**
*г. Валожын.*

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении повторных электронных торгов | |
|---|---|
| Организатор электронных торгов | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390. Тел. +375 17 310-36-37 |
| Продавец | РО «БЕЛАГРОСЕРВИС», г. Минск, ул. Козлова, д. 25а. УНП 190431542 |
| Оператор ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**
Местонахождение: Минский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская 29 а

| Лот № | Наименование лота | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Агрегат посевной AMAZONE Cirrus 6001 Super,** 2007 г. в. | **46 099,20** |
| 2 | **Сеялка точного высева Kverneland Unicorn «id 7240»,** 2010 г. в. | **4 845,60** |
| 3 | **Погрузчик АМКОДОР 332С,** 2005 г. в. | **54 000,00** |
| 4 | **Трактор «Беларус-82.1»,** 2009 г. в. | **14 760,00** |
| 5 | **Комбайн зерноубор. КЗС-1218-10 «Палессе»,** 2010 г. в. | **88 800,00** |
| 6 | **Трактор «Беларус-952,** 2006 г. в. | **13 800,00** |
| 7 | **Автомобиль МАЗ-5551 03-2125Р,** 2005 г. в. | **15 300,00** |
| 8 | **Прицеп-самосвал МАЗ 8571 020,** 2005 г. в. | **4 500,00** |
| 9 | **Трактор «Беларус-2022.3»,** 2007 г. в. | **26 640,00** |
| 10 | **Трактор «Беларус 3022» ДЦ,** 2012 г. в. | **16 800,00** |
| 11 | **Трактор «Беларус 82.1»,** 2009 г. в. | **14 880,00** |
| 12 | **Почвообр. агрегат АПН-3 ,** 2011 г. в. | **8 640,00** |
| 13 | **Плуг полунавес. оборот. ППО-8-40К,** 2010 г. в. | **6 600,00** |
| 14 | **Трактор «Беларус МТЗ 82.1»,** 2009 г. в. | **15 480,00** |
| 15 | **Трактор «Беларус МТЗ 82.1»,** 2013 г. в. | **22 800,00** |
| 16 | **Автомобиль MAZ 551605 4275РБ,** 2013 г. в. | **40 560,00** |
| 17 | **Автомобиль MAZ 6501 А8-325-000,** 2013 г. в. | **50 760,00** |
| 18 | **Двигатель КАМАЗ-740** | **5 598,00** |
| 19 | **Двигатель SW-680 на комбайн BIZON** | **1 494,84** |
| 20 | **Двигатель DETROIT DT530E для УЭС-250** | **29 637,82** |
| 21 | **Двигатель А-41** | **2 891,40** |
| 22 | **Двигатель ЯМЗ-238 евро 0** | **4 465,68** |
| 23 | **КПП К-700** | **7 349,47** |
| 24 | **КПП «Беларус 3022»** | **11 598,46** |
| 25 | **Корпус сцепления Беларус 2522 2822дц-1600010** | **29 497,26** |
| 26 | **ГПМ – Амкодор** | **12 834,48** |
| 27 | **Аппарат питающий ПКК 0108000Б** | **5 354,46** |
| 28 | **Редуктор бортовой КЗР-10** | **1 000,01** |
| 29 | **Измельчитель питающий КПК-3000 в сборе** | **10 875,61** |
| 30 | **Подборщик пресподборщика ПРФ-145** | **1 000,00** |
| 31 | **Корпус сцепления МТЗ-2522** | **6 732,00** |
| 32 | **Партия поперечин 822-4605065 (29 шт)** | **12 423,60** |

**Шаг торгов – 5 % от текущей цены**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета торгов перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

**Срок оплаты предмета аукциона: 10 (десять) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Дата и время начала и окончания электронных торгов с 11.00 до 11.10 по лотам №№ 1–17 – 09.07.2025, по лотам №№ 18–32 – 24.07.2025.**
**Дата и время окончания приема заявок** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by).: **по лотам №№ 1–17 – по 08.07.2025, по лотам № 18 – по 23.07.2025**

**Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу (gki.gov.by)**

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35.**
**E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», ул. Немига, 40, пом. 46, офис 2, г. Минск. |
| Продавец | ОАО «Могилевоблресурсы». г. Могилев, ул. Залуцкого, 23. |
| Оператор ЭТП/ Адрес ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», ул. Немига 40, пом. 46, офис 1, г. Минск. **www.ipmtorgi.by** |

| № лота | Предмет электронных торгов | Начальная цена с НДС 20 %, руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль грузовой платформа тентовая MAZ 437041-262,** рег. знак ТВ4580, 2007 г. в. | 18 336,00 |
| 2 | **Полуприцеп бортовой MAZ 975800-2012,** рег. знак. А6672 А-6, 2010 г. в. | 11 328,00 |

**Местонахождение – г. Могилев, ул. Залуцкого, д. 23**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 5 (пять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **6 %** от цены продажи лотов в течение **3 (трех) рабочих дней** после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущая публикация в газете «Звязда» от 17.05.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 02.07.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 01.07.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 29-154-34-35.**
**E-mail: auction@cpo.by**

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
ОАО «Н Холдинг»
проводит открытый аукцион
по продаже недвижимого имущества

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ЛОТ № 1 | Капитальное строение с инв. № 500/С-49013, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 8/6. Площадь – 326,5 кв. м. Наименование – здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения). Назначение – здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения). Обременение: аренда. Капитальное строение с инв. № 500/С-56446, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 8/14. Площадь – 20,2 кв. м. Наименование – насосная станция. Назначение – сооружение неустановленного назначения. Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 500000000005005775, площадью 3,2282 га, предоставленном продавцу на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен). На земельном участке установлены следующие ограничения: охранная зона линий электропередачи, площадь 0,4265 га; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,4265 га; охранная зона сетей и сооружений канализации, площадь 0,4265 га; охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, площадь 0,0490 га; охранная зона сетей и сооружений газоснабжения, площадь 0,4265 га | | | | |
| Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN | 362 370,00 | Задаток, BYN | 36 237,00 | Шаг аукциона | 5 % |
| Сведения о продавце / организаторе аукциона, его местонахождение и контактные телефоны | ОАО «Н Холдинг» 220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1. тел: 8 017 284 94 32, 8 029 754 63 46 Мария, e-mail: arenda@h-holding.by | | | | |
| Срок подписания договора купли-продажи | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение 10 (десяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить продавцу/организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного продавцом/организатором аукциона | | | | |
| Условия оплаты | Оплата задатка производится не позднее даты подачи заявления на участие в аукционе резидентами в белорусских рублях (не резидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 1000 1634 1000 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240 ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 22 июля 2025 включительно** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 | | | | |
| Место, дата и время проведения аукциона | Аукцион состоится **23 июля 2025 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» | | | | |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время, без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ**

| | |
|---|---|
| Организатор электронных торгов | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| Продавец | ДУП «Автомобильный комбинат» УП «Минскоблсельстрой», г. Минск, ул. Бабушкина, д. 17. УНП 690019100 |
| Оператор ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**
Местонахождение: г. Минск, ул. Бабушкина, 17

| Лот № | Наименование | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Трактор с бульдозерным оборудованием ДТ-75 ДЕРС-2** | 15 000,00 |
| 2 | **Экскаватор ЕК-12-00** | 27 450,00 |

**Шаг торгов – 5 % от начальной цены**

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 08.07.2025. Дата и время окончания приема заявок:** принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by по **07.07.2025 до 17.00.**

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Минского облисполкома и Госкомимущества

**Контактные телефоны: +375(17)310-36-37; +375(29)154-34-35, auction@cpo.by**

# ПАГРАНІЧНІКІ СУСТРАКАЛІ ВОРАГА ПЕРШЫМІ

Яны, нашы вартавыя граніцы, сустрэлі фашысцкую навалу першымі і мужна змагаліся за кожны метр зямлі на пагранічных заставах. Вельмі шмат іх палягло ў самыя першыя дні вайны.



У Музеі абароны Брэсцкай крэпасці ёсць нямала матэрыялаў, дакументаў, прысвечаных 17-му Чырванасцяжнаму пагранічнаму атраду, які ахоўваў 182 кіламетры дзяржаўнай граніцы. У склад атрада ўваходзіла пяць камендатур. У зоне адказнасці кожнага начальніка камендатуры было чатыры лінейныя і адна рэзервовая заставы. І ўсе гэтыя заставы перад світаннем 22 чэрвеня адчулі на сабе масіраваны ўдар ворага.

У музеі захоўваюцца ўспаміны былога начальніка 20-й заставы Ягора Манекіна: «Кулямёты праціўніка трасіруючымі кулямі прастрэльвалі наша ўзбярэжжа, тым самым стваралі спрэс агнявую заслону. З-за Буга курсам на ўсход ляцелі фашысцкія самалёты. Запальвальныя снарады ўшчэнт разносілі назіральныя пагранічныя засады. Сілай пяхотнага батальёна гітлераўцы пачалі пераправу праз Буг. Перашкодзіць пераправе нам не было чым. У нас не было ні танкаў, ні гармат, ні мінамётаў».

Пагранічнікі 20-й заставы стаялі літаральна насмерць, вытрымалі сем атак. Праціўнік ніяк не чакаў, што нашы вартавыя граніцы прадэманструюць такое ўменне манеўраваць. З кулямётамі ў руках яны хутка мянялі пазіцыі і ўдала супрацьстаялі ворагу. Калі ўмелага кулямётчыка сяржанта Філатава забіў варожы снайпер, кулямёт адразу ж падхапіў радавы Ермакоў. І прытым наўкола бушаваў лясны пажар, рукі і твар Ермакова былі ў страшных апёках, але і ў такім стане ён працягваў страляць!

...Камандзір Ягор Манекін здолеў вывесці рэшткі байцоў сваёй заставы на ўсход, там яны далучыліся да часцей рэгулярнай арміі. Пагранічнік Манекін прайшоў усю вайну, у яго франтавой біяграфіі было тры франты: Бранскі, Другі Прыбалтыйскі, Ленінградскі. Пасля вайны Ягор Піліпавіч вернецца ў пагранвойскі, дaслужыцца да палкоўніка, потым будзе жыць у Маскве. Амаль праз 30 гадоў пасля Перамогі прыедзе на сустрэчу ветэранаў у Брэсцкую крэпасць. Яго ўспаміны, цытаты з якіх прыведзены, стануць бясцэннай старонкай летапісу доблесці заходніх вартавых граніцы.

Гэта толькі адзін эпізод мужнасці і самаадданасці пагранічнікаў. А падобныя эпізоды былі на кожнай з застаў легендарнага 17-га пагранічнага атрада. І менавіта ў гонар іх, папярэднікаў, якія загінулі ў 1941-м, брэсцкія пагранічнікі 21 чэрвеня штогод праводзяць акцыю «Баявы разлік».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**



## У тэму

Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа будзе маштабна адзначаны ў Брэсце. Ранкам 21 чэрвеня адкрыецца музейная экспазіцыя «Цягнік Перамогі» каля Музея чыгуначнай тэхнікі. А бліжэй да поўдня на вакзале адбудзецца сустрэча ўдзельнікаў «Цягніка Памяці».

Беларускія і расійскія артысты выступяць ноччу 22 чэрвеня на канцэрце-рэквіеме ў Брэсцкай крэпасці. Канцэрт атрымаў назву «Чатыры гады доўгага шляху». Чакаецца, што ўдзел возьмуць Уладзімір Гасцюхін, Аляксандра Гайдук, арт-група «Беларусы», танцавальныя калектывы з Пінска, а таксама расійскія выканаўцы, сярод якіх — Дзяніс Майданаў, група «Любэ» і іншыя.

Пачнецца праграма ў Брэсцкай крэпасці ў гадзіну ночы трансляцыяй фільма «Пісьмы абаронцам Брэсцкай крэпасці». Затым пройдзе канцэрт-рэквіем, а за ім — традыцыйны мітынг з ускладаннем кветак да Вечнага агню і пліт некропаля. У 5 гадзін раніцы рэканструктары пакажуць эпізоды абароны Брэсцкай крэпасці. Пра свой удзел у рэканструкцыі заявілі больш за 600 членаў ваенна-гістарычных клубаў з розных краін.

## Дарэчы

### Вартавым непарушнай граніцы



Каля Паўночных варот Брэсцкай крэпасці сёння адкрыецца скульптурная кампазіцыя «Савецкім пагранічнікам прысвячаецца».

У ходзе сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з міністрам абароны Расіі Андрэем Белавусавым, якая адбылася 16 мая, ад кіраўніка расійскага ваеннага ведамства паступіла прапанова аб перадачы на бязвыплатнай аснове скульптурнай кампазіцыі воінам-пагранічнікам для ўстаноўкі ў Брэсце.

Кіраўнік нашай дзяржавы падтрымаў прапанову і прыняў рашэнне ўстанавіць гэты помнік да Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа. Скульптура, якая распрацавана маскоўскай Студыяй ваенных мастакоў імя М. Б. Грэкава, была дастаўлена ў Беларусь два тыдні таму і ўстаноўлена на пастаменце каля Паўночных варот Брэсцкай крэпасці.

Манумент вышынёй больш за тры метры ўяўляе сабой кампазіцыю з фігур чатырох воінаў-пагранічнікаў, якія ўстанаўліваюць памежны слуп. Помнік сімвалізуе перыяд вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у ліпені 1944 года, аднаўленне Дзяржаўнай граніцы СССР і пераможнага заканчэння аперацыі «Баграціён», а таксама сведчыць аб бязмежнай павазе нашчадкаў да подзвігу тых, хто вызваляў краіну ад «карычневай чумы».

У цырымоніі адкрыцця помніка возьмуць удзел прадстаўнікі ваенных ведамстваў Беларусі і Расіі, кіраўнікі органаў улады, прадстаўнікі грамадскасці.




## СПЫНІСЯ НА ХВІЛІНУ!

**У нядзелю, 22 чэрвеня, у Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа, у 12:00 па ўсёй Беларусі пройдзе агульнанацыянальная хвіліна маўчання.**

У эфіры тэлебачання і радыё, у воінскіх калектывах, на вуліцах, плошчах, у населеных пунктах раздасца рытм ударaў метранома і мелодыя рэквіема.

Ва ўсіх храмах краіны прагучыць звонавы набат. Наземны транспарт выдасць сігнальныя гудкі. На некаторых участках дарог спыніцца рух.

**Беларусь памятае! Памятае кожнага! Спынімся на хвіліну — успомнім усіх, хто пайшоў у неўміручасць і завяшчаў нам жыць.**

Неасабісты суб'ектыў

# СВАЯ ЦЯЖКАЯ НОША

## Яна патрэбна толькі нам самім



У мінулую суботу давялося ехаць у вёску на таксі (балазе, недалёка ад сталіцы, часам, калі абставіны вымагаюць, можна сабе дазволіць). Таксіст Аляксандр, прыблізна мой равеснік, аказаўся цікавым і дапытлівым суразмоўцам. Таму, едучы, паказвала яму ўсе нашы цікавосткі, расказвала гісторыю... Калі мінулі найвышэйшую кропку Беларусі, гару Дзяржынскую, паказала яму на вялікую вёску злева ад дарогі: «Гэта Скірмантава. Сястра Хатыні. Толькі людзей тут спалілі значна больш — каля 280 чалавек, дагэтуль дакладная лічба невядомая, бо былі людзі і з іншых вёсак...» «А помнік там ёсць?» — спытаў мой спадарожнік. Атрымаўшы станоўчы адказ, раптам папрасіў: «А можна, туды заедзем? На некалькі хвілін...»

Мы пад'ехалі на плошчу да простага помніка, зробленага ў стылістыцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя, і кіроўца — гэты гаваркі жартаўнік — раптам стаў сур'ёзным, выйшаў з машыны, нейкія імгненні пастаяў, схіліўшы галаў, думаючы аб чымсьці сваім. Далей мы паехалі моўчкі, і я, напэўна, так і не знайшлася, як перарваць маўчанне, калі б ён сам не патлумачыў: «У мяне бабуля родам з Драмлёва, чулі, напэўна. У яе там згарэла ўся сям'я — маці, сястрычкі, брацік. Яна, старэйшая, перад самай вайной выйшла замуж у Жабінку. Таму і засталася жывой... І мама мая нарадзілася, і я, і дзеці мае, і ўнучка. А тыя, малодшыя, нікога не нарадзілі. І няма ў нас вялікай радні, як магло б быць... І гэтыя, што ў вас, таксама нікога не нарадзілі... Я заўсёды ля гэтых помнікаў спыняюся. І, ведаеце, аб чым больш за ўсё думаю: гэта ж зусім нядаўна было, нават сто гадоў не мінула. Як, як такое можна было тварыць? Людзі гэта былі ці антыхрыст тады на зямлю прыйшоў у тысячах абліччаў?» Ён задаваў пытанні, на якія не чакаў пачуць адказ. А я і не ведала, што адказаць, толькі ў галаве круцілася гэта, даўно ўжо адчутае і пацверджанае: мы ўсе параненыя той вайной. Праз пакаленне, праз два — яна ўсё роўна нагадвае аб сабе...

Выйшла каля хаты, павіталася з суседкай. Цётцы Тані 85, яе сястры на год больш. Яны — сіроты той вайны — іхняга бацьку расстралялі і спалілі фашысты. Не знайшоўшы ў вёсцы партызан, яны вывелі на плошчу ўсіх мужчын і, як у дзіцячай лічылцы, падзялілі: ты — направа, ты — налева. Тых, што злева, адпусцілі, тых, што справа, забілі і спалілі ў хляве. Маці дзяўчатак знайшла яго сярод іншых па рэштках вопраткі, загарнула ў прасцінку і пахавала. Бог даў ёй і дочкам доўгі век — пэўна, і за яго, а можа, каб даўжэй памяталі, каб паспелі ўсім расказаць.

Ідзе па вясковай вуліцы сын цёткі Ядзі, сам ужо ўнукаў дзядуля. Яго бабулю, маці цёткі Ядзі, застрэлілі паліцаі на ганку хаты, якую перад гэтым падпалілі. Цётку Ядзю пагналі ў Германію. Там яна працавала на мясцовага пана, ела са свінога карыта, гаспадыня вырвала ёй усе валасы, цягаючы за касу... Прыехаў з Мінска яшчэ адзін сусед, крычыць здалёк: «Прывітанне!» Яго бабуля ўсё жыццё хадзіла з палачкай: падчас карнай аперацыі, якую ладзілі фашысты каля Станькава, яна з малой дачкой на руках, мамай суседа, тры дні праседзела па пояс у багне, а на двары быў сакавік. Дзяцей яна больш нарадзіць не змагла, а застуджаныя суставы на каленях на ўсё жыццё зрабілі калекай...

ТАКІХ гісторый — жудасных па сваёй сутнасці, невераґодных па сваёй бесчалавечнасці — на гэтай зямлі безліч. Кожны прыгадае, літаральна — кожны. Не пра сваіх самых блізкіх, дык пра землякоў, суседзяў, нават незнаёмых людзей, якія, як той таксіст, проста выпадкова сустрэліся на шляху. Страшная, цяжкая ноша, якую несці самім. Яе ніхто ў нас не падхопіць, не дапаможа. А хтосьці вельмі б нават хацеў, каб мы яе кінулі і ішлі далей, забыўшыся і не азіраючыся.

МЫ, наіўныя ў сваёй адкрытасці і шчырасці, у сваёй гатоўнасці дараваць, думалі, што будзе інакш. Што тыя, што няхай сабе і праз паўстагоддзя паспрабавалі загладзіць хоць трохі сваю віну, сапраўды раскаяліся і разумеюць, што нарабілі тут іх бацькі і дзяды, што ім як мінімум сорамна. Нічога падобнага. У іх — іншая сямейная гісторыя той вайны. Іншыя помнікі на магілах. Калі б яны перамаглі тады, яны б сёння з гонарам расказвалі аб удала праведзеных аперацыях з такімі рамантычнымі назвамі кшталту «Зімовае чараўніцтва». Вы сумняваецеся, што было б інакш? Я асабіста — ні на каліва. Але яны не перамаглі і прыдумалі сабе іншую вайну. Спытайце ў каго з нашчадкаў тых, хто тут расстрэльваў, паліў, здзекаваўся, дзе быў іх продак у 1942—43-м. Вы здзівіцеся: усе былі кухарамі, дарожнымі рабочымі, пасыльнымі — суцэль бяскрыўдныя мабілізаваныя, якіх ні за што кашмарылі партызаны.

Я ўжо пісала пра выпадак, які расказалі мне калісьці ў архіве кінафонафотадакументаў, але дарэчы будзе прыгадаць яго зноў. У 90-я гады яны павезлі фотавыстаўку пра злачынствы нацыстаў (гэта былі трафейныя фота, яны любілі здымацца на фоне таго, што тварылі) у нейкі нямецкі горад. І адна пажылая фрау ў каменданце Оршы, які пазіраваў побач з уласнаручна павешанымі ім людзьмі, з жахам прызнала свайго бацьку. Паводле сямейнай легенды, татка быў інжынерам, рамантаваў чыгунку, якую падрывалі партызаны, і гэтыя бандыты забілі яго ні за што. Насамрэч татка быў адным з тых ваенных злачынцаў, якіх удалося захапіць і якіх судзілі па іх страшных пякельных слядах увосень 1944-га ў Мінску. Фрау прыязджала ў Дзяржынск, ёй паказалі кінахроніку таго суда. Яна, расказвалі супрацоўнікі архіва, выйшла з кіназалы са словамі: «Вы дзіўны народ, калі вы можаце такое дараваць...» А цяпер давайце ўявім, што падобнае адбылося б не ў 90-я, калі апраўдваць фашызм было нельга, а ў нашы дні, калі — можна. Фрау заявіла б, што беларусы зрабілі фотамантаж і лямантавала б, што добрае імя яе бацькі збэсцілі. Гарачую навіну падхапілі б як мінімум сацыяльныя сеткі...

ГЭТА я пра тое, што чакаць ні разумення, ні сораму, ні тым больш пакаяння нам сёння не варта. 22 чэрвеня для нас — дзень жалобы і памяці, але нават у гэты дзень мы згадваем, што ўсе жахі мы вытрымалі, мы выжылі, мы перамаглі. Для іх жа гэты дзень — дзень ганьбы, дзень пачатку канца. І што з таго, што мінула некалькі пакаленняў? Аб'ектыўна яно застаецца менавіта так. І вы думаеце, яны не хочуць, каб мы пра гэты дзень, і пра 3 ліпеня, і пра 9 мая, назаўжды забыліся?

Я не пра варожасць і не пра тое, што кагосьці трэба дакараць і ненавідзець. Я пра тое, што наша памяць і наш боль — толькі нашы памяць і наш боль, больш нічые. І захоўваць іх толькі нам, і перадаваць іх дзецям толькі нам, больш нікому.

НАВОШТА? Я вельмі спадзяюся, што менавіта ў нашай краіне гэта зразумела без тлумачэнняў.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона**

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390. (www.cpo.by) |
| Продавец | ОАО «НКФО «Белинкасгрупп», 220028, г. Минск, ул. Либаво-Роменская, 23. УНП 807000270 |
| Оператор ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191 224 638 (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронного аукциона: транспортные средства, бывшие в употреблении**
**Месторасположение: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 69**

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, руб. |
|---|---|---|
| 1 | VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK 19277, рег. знак АР 8176-7, 2014 г. в. | 10 436,75 |
| 2 | VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK 19277-01, рег. знак АР 8243-7, 2014 г. в. | 10 436,75 |
| 3 | VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK 19277, рег. знак АР 8177-7, 2014 г. в. | 10 484,75 |
| 4 | FORD TRANSIT INDEEC 29459-04, рег. знак АС 0218-7, 2012 г. в. | 4 508,75 |
| 5 | FORD TRANSIT VAN INDEEC 29459-04, рег. знак АР 8178-7, 2010 г. в. | 4 688,75 |
| 6 | FORD CONNECT INDEEC 294591-01, рег. знак АР 9557-7, 2011 г. в. | 3 176,75 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов:** в течение 30 календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)

Победитель электронных торгов, либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **8–10 %** от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до момента определения победителя торгов, без объяснения причин снятия

Извещение о проведении предыдущих электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 24.05.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 02.07.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 01.07.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении электронных торгов в форме открытого аукциона**

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| Продавец | ОАО «Ивацевичдрев», Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 2. УНП 200100328 |
| Оператор ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 **(www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронного аукциона**
Адрес: Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная 2

| № лота | Наименование | Инвен. № | Начальная цена лота с НДС, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Грузовой седельный тягач MAZ 5440A8 360-030, рег. № 1 KM T 0632,** 2010 г. в. | 9502 | **17 040,00** |
| 2 | **Автомобиль грузовой бортовой тентовый MAZ 437143-331, рег. № 1 KI T 2263,** 2010 г. в. | 042582 | **25 920,00** |
| 3 | **Автомобиль грузовой бортовой тентовый MAZ 6303 A5-321, рег. № 1 KM T 0633,** 2008 г. в. | 1711 | **53 040,00** |
| 4 | **Автомобиль грузовой бортовой тентовый GAZ A21R32 «BELAVA-1302», рег. № 1 KI T 1997,** 2020 г. в. | 066 | **70 560,00** |

**Шаг аукциона: 5 % от текущей цены**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель торгов, либо единственный участник, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 8 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 24.07.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие принимаются по 23.07.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**

## Извещение о проведении электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. **www.ipmtorgi.by** |
| **Продавец** | ГСПК № 9 Центрального района г. Гомеля, Гомельская обл., микрорайон № 20а г. Гомеля. |

**Предмет электронных торгов**
**Местонахождение – г. Гомель, ул. Чечерская, ГСПК 9**

| № лота | Наименование | Начальная цена без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Комплектная трансформаторная подстанция КТП 50кВА** | 1 800,00 |
| 2 | **Кабель силовой алюминиевый ААШв(ож)-10, длина 695 м, в комплекте с барабаном для электрических кабелей тип 18б** | 11 597,04 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 5 (пять) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **8–10 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

